УДК 821.161.3

# НОВЫЯ ФАКТЫ ДА ЖЫЦЦЯПІСУ І ТВОРЧАСЦІ СЯРГЕЯ КРЫЎЦА

**Юркойць Дзмітрый Алегавіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
(г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны жыццяпісу і творчасці заходнебеларускага паэта Сяргея Крыўца (1909–1945). З дапамогай аналізу матэрыялаў перыядычных выданняў Заходняй Беларусі былі запоўненыя пэўныя лакуны ў біяграфіі паэта, што дазваляе паддаць сумневу існуючыя звесткі аб месцы пражывання і працы С. Крыўца з 1933 па 1944 гады.*
**Ключавыя словы:** Сяргей Крывец, паэт, творчасць, жыццяпіс, біяграфія.

*The article is devoted to the biography and work of the Western Belarusian poet Sergei Krivets (1909-1945). By analyzing the materials of periodicals in Western Belarus, certain gaps in the poet's biography have been filled in, which makes it possible to question existing information about the place of residence and work of S. Krivets from 1933 to 1944.*
**Keywords:** Sergey Krivets, poet, creativity, biography.

Сяргей Міхайлавіч Крывец (1909 – 13 траўня 1945) – прадстаўнік «масавай» плыні заходнебеларускай паэзіі. Як і шмат іншых тагачасных паэтаў, ён зазнаў усе цяжкасці жыцця на «крэсах усходніх». Пра яго біяграфію і творчасць даследчыкі ведаюць надзвычай мала (што казаць, калі нават дату смерці аўтара літаратуразнаўцы звычайна ўказваюць памылковую – 28 красавіка), найбольш інфарматыўным выданнем з'яўляецца зборнік «Дубок» (1972) [1], выдадзены намаганнямі Рыгора Шырмы і Максіма Танка. Акрамя таго, некаторыя вершы паэта публікаваліся ў калектыўных выданнях паэзіі Заходняй Беларусі. У



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прадмове са згаданага зборніка і ў некаторых змешчаных у ім творах ужо былі выяўлены істотныя недакладнасці факталагічнага характару, выкліканыя канкрэтнымі прычынамі; выказвалася таксама думка аб неабходнасці перагляду і ўдакладнення існуючай інфармацыі пра жыццяпіс і творчасць паэта, у чым немалаважную ролю могуць адыграць тыя перыядычныя выданні, што друкаваліся пры жыцці С. Крыўца [2]. У дадзеным артыкуле мы дапоўнім знойдзеныя раней звесткі пра С. Крыўца на старонках заходнебеларускіх перыёдыкаў, што дазволіць стварыць больш аб`ектыўнае ўяўленне пра асобу аўтара.

На беларускай тэрыторыі, далучанай да II Рэчы Паспалітай згодна з Рыжскай дамовай 1921 г., было не так шмат перыядычных выданняў, якія існавалі бесперапынна на працягу хаця б некалькіх гадоў і, да таго ж, адводзілі месца пад літаратурныя творы. Гун-Брыт Колер слушна заўважае, што «*галоўнай характарыстыкай перыядычнага друку ў Заходняй Беларусі з`яўляецца высокая прэкарнасць, пра што сведчыць вялікая колькасць недаўгавечных медыя*» [3, с. 271]. «Шлях моладзі» (1929–1939) – адзін з нешматлікіх часопісаў (хрысціянска-дэмакратычнага кірунку), які выходзіў цягам 10 год і быў не толькі прысвечаны сацыяльным, грамадска-палітычным пытанням, але і спрычыніўся развіццю заходнебеларускага літаратурнага працэсу. У выданні актыўна публікавалі творы аўтараў-пачаткоўцаў, а ўзаемадзейнічала з паэтамі рэдакцыя праз «Паштовую скрынку». Акрамя таго, у рубрыцы «З краю» чытачы часопіса дзяліліся рэаліямі жыцця Заходняй Беларусі. Менавіта гэтыя дзве рубрыкі з`яўляюцца важнымі для атрыбуцыі літаратурных з`яў і фактаў.

У 1 нумары «Шляху моладзі» за 1932 г. у рубрыцы «Наша пошта» упершыню згадваецца С. Крывец. Праўда, звяртаюцца да паэта «*С. Пастушок*» (адзін з ранніх псеўданімаў аўтара): «*С. Пастушку з Горадні. Вершы слабыя, пішэце лепш прозай з жыцьця вёскі*» [4, с. 18] (тут і далей арфаграфія і пунктуацыя першакрыніц захоўваецца – Д. Ю.). Гэты допіс не супярэчыць абсалютнай большасці выданняў, у якіх значыцца, што з 1930 па 1933 гг. С. Крывец жыў і працаваў у Гародні. Аднак звестак пра тое, дзе быў аўтар пасля 1933 г., – вобмаль. У рознага кшталту даведніках сцвярджаецца ([5, с. 3], [6, т. 3, с. 432] і інш.), што пасля гарадзенскага перыяду паэт жыў у Беластоку ажно да 1944 г. Між тым, наступныя допісы ў «Шляху моладзі» ставяць пад сумнеў дадзеную інфармацыю.

У 17 нумары часопіса за 1938 г. у рубрыцы «З краю» чытаем допіс пад назвай «*П`янства, разбой і часапісы*» [7, с. 8], дзе аўтар

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пад крыптанімам «*С. Кр*» апісвае жыццё моладзі ў вёсцы «*Лунна. Горадзенскага пав.*». Ён адзначае, што «*ня так даўно выпісаў "Шлях моладзі"*». Сапраўды, у 8 нумары выдання за той жа год у «Паштовай скрынцы» рэдакцыя адказвала: «*С. Крыўцу: Верш надрукуем, часапіс будзем высылаць*» [8, с. 8]. У 21 нумары «Шляху моладзі» за 1938 г. апублікаваны допіс пад назвай «*Holas lasnoha rabotnika*» [9, с. 8] пад крыптанімам «*S. Kr*», месца пазначана: «*v. Suchinicy, Dubienskaj vol., Horadzienskaha pav.*». Аўтар паведамляе, што «*uvosieni 1937 h. uzialy my й kazionnym lesie dzialanki, katoryja abaviazalisia vyrabic, dastajučy za heta płatu ad vyrabatku <...>*». Працаўнікі зразумелі, што плата занадта нізкая, і паскардзіліся на гэта лясьнічаму М. Вярбіцкаму, які і чуць не хацеў пра надбаўкі, але адправіў іх да надлеснага, які, быццам бы, кіруе фінансамі. Пакуль працаўнікі ішлі да надлеснага, зайшлі да іншай групы лясных работнікаў. Неўзабаве з'явіўся «*z hajovymi lasničy M. V. i zahadaŭ papisac nas jak "podburzycieli da strajku", zakidajučy nam roznyja niabylicy. Mnoha było šumu <...>*». Пасля лясьнічы ўсё ж паабяцаў надбаўку, але пасля выкананай работы работнікі даведаліся, што ён падмануў. І нават падаў у суд: «*Sud u Skidlu razhladaŭ spravu rabotnikaŭ abvinavačanych na asnovie danosu l sničaha, za padburennie da strajku <...> My adnak ad prysudu hetaha padali apelacyju й Horadniu*». Напрыканцы аўтар выказвае спадзеў, што справядлівасць пераможа. Цікава, што ў 1937 г. С. Крывец апісвае ўражанні ад канцэрта М. Забэйды-Суміцкага ў Беластоку [10, с. 143]. Цалкам верагодна, што паэт проста бываў у горадзе, жывучы пастаянна на малой радзіме. Таму што менавіта ў Сухнічах ён нарадзіўся, нягледзячы на тое, што некаторыя крыніцы падаюць месцам нараджэння вёску Дубна. Сухнічы, Дубна, Лунна (таксама часам падаецца як месца нараджэння [11, с. 8]) – вёскі, якія знаходзяцца блізка адна ад адной.

У наступным нумары (22) пад такім жа крыптанімам, праўда, кірыліцай, С. Крывец скардзіцца, што «*сьвяшчэннік вучыць бел. праваслаўных дзяцей маліцца папольску*» [12, с. 8], месца ўказана тое ж: «*Сухенічы, Дубенскай вол., Горадзенскгаа пав.*»

Мы ўжо звярталі ўвагу на тое, што, хутчэй за ўсё, акрамя вядомых псеўданімаў, С. Крывец падпісваўся «Mars» [2, с. 65]. Пад такім подпісам аўтар у адным з нумароў часопіса скардзіўся, што навучанне ў мясцовых школах вядзецца па-польску [13, с. 8]. На карысць таго, што гэты псеўданім належыць С. Крыўцу, гаворыць тое, што карэспандэнцыя прыйшла з усё тых жа Сухініч. Да таго ж, у 4 нумары



Электронный архив библиотеки ИГУ имени А.А. Кулешова

«Шляху моладзі» за 1939 г. у паштовай скрынцы чытаем: «*Marsu: Prośbu й spravie knižak pieradali kniharni “Pahonia”. Vieršy da druku nie padchodziać, ale zdolnaści da piara majecie i treba ich razvivać*» [14, с. 8]. Значыць, уладальнік псеўданіма займаўся літаратурай. А ў 10 нумары таго ж года рэдакцыя звяртаецца да «S. Marsa» (ці не да Сяргея?): «*Karespandencyju vykarystajem. Vieršy słabyja. Knižki možacie addać za 1.55 zł. Probnyja numary vysyłajem. Z pryčyny ciarpienniaй, jakija musili Vy pieražyć, pasyłajem Vam ščyry spahad*» [15, с. 8].

Знойдзеная інфармацыя дазваляе паставіць пад сумнеў інфармацыю пра тое, што С. Крывец з 1933 па 1944 г. бесперапынна жыў у Беластоку. Акрамя таго, ёсць падставы сцвярджаць аб тым, што паэту належыць псеўданім «Mars». Далейшае падрабязнае вывучэнне разнастайных рубрык заходнебеларускіх перыядычных выданняў дазволіць запоўніць існуючыя лакуны ў жыццяпісах творцаў Заходняй Беларусі.

## Літаратура


1. Крывец, С. Дубок / С. Крывец. – Мінск : Беларусь, 1972. – 86 с.
2. Юркойць, Д. А. Пра што сведчаць старонкі перыядычнага друку: да праблемы асэнсавання творчасці Сяргея Крыўца (1909–1945) / Д. А. Юркойць // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2024. – № 1. – С. 62–69.
3. Гун-Брыт Колер. Выбраныя працы па беларускім літаратуразнаўстве / склад. П. І. Навуменка; пад агул. рэд. П.І. Навуменкі. – Мінск: БДУ, 2021. – 419 с.
4. Наша пошта // Шлях моладзі. – 1932. – № 1 (36). – С. 18
5. Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 303–304.
6. Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы Акад. навук Рэсп. Беларусь. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1992–1994.
7. З краю // Шлях моладзі. – 1938. – № 17 (133). – С. 8.
8. Паштовая скрынка // Шлях моладзі. – 1938. – № 8 (124). – С. 8.
9. З краю // Шлях моладзі. – 1938. – № 21 (137). – С. 8.
10. Крывец, С. У Беластоку / С. Крывец // Беларускі летапіс. – 1937. – № 6–7. – С. 143.
11. Глагоўская, Л. Сяргей Крывец – вакол вядомага і невядомага / Л. Глагоўская // Ніва. – 2012. – № 10. – С. 8.
12. З краю // Шлях моладзі. – 1938. – № 22 (138). – С. 8.
13. З краю // Шлях моладзі. – 1939. – № 14 (156). – С. 8.
14. Паштовая скрынка // Шлях моладзі. – 1939. – № 4 (146). – С. 8.
15. Паштовая скрынка // Шлях моладзі. – 1939. – № 10 (152). – С. 8.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова